# НАГОДА СВЯТКАВАЦЬ РАЗАМ

**Ужо заўтра, 25 чэрвеня, тэлеканалу АНТ спаўняецца 20 гадоў. Незалежна ад таго, як мяняюцца сезоны, інфармацыйны парадак дня, запыты аўдыторыі, тут знаходзяць магчымасць не губляць сваіх гледачоў, таму што тэлевізійны інфапрадукт робяць сапраўдныя прафесіяналы.**

Пацвердзіла тое і перамога ў пяці намінацыях на сёлетняй Нацыянальнай тэлевізійнай прэміі «Тэлевяршыня». Нагадаем, найвышэйшай адзнакай журы адзначыла рэжысёрска-пастановачную групу тэлепраекта АНТ «XII Нацыянальны конкурс прыгажосці «Міс Беларусь», серыю журналісцкіх расследаванняў тэлеканала, праграму палітычнага аглядальніка Ігара Тура «Прапаганда», найлепшай інфармацыйнай праграмай прызналі «Нашы навіны», а «Наша раніца» атрымала ўзнагароду як найлепшая ранішняя інфармацыйна-забаўляльная праграма. У новай намінацыі гэтага года «Адзіны фронт» за сумесную работу розных СМІ ў межах адной тэмы былі адзначаны рэпарцёр Андрэй Аляксандраў і аператар Іван Баравы.




У дзень нараджэння тэлеканал АНТ таксама будзе радаваць сваю аўдыторыю сюрпрызамі. Так, у выпуску «Наша раніца ў суботу» гледачоў чакае святочная «ялінка з падарункамі». А вечарам не прапусціце спецыяльны выпуск праграмы «Што? Дзе? Калі?»: каманда тэлевізіёншчыкаў згуляе супраць тэлегледачоў. У нядзелю глядзіце ў вячэрнім эфіры выпуск «20 гадоў АНТ. Нагода пагаварыць». А мы віншуем тэлеканал АНТ з надыходзячым днём нараджэння і жадаем яшчэ доўгія гады збіраць сваю аўдыторыю каля экранаў!

**Алена ДРАПКО.**

---

## ШАШКІ
**(«Звязда»)** Выпуск № 168

З 13 да 15 чэрвеня ў Оршы адбылася адкрытая рэспубліканская спартакіяда школьнікаў па шашках-64. Перамагла каманда Гродзенскай вобласці. На другім месцы — шашысты Мінска, «бронза» — у Гомельскай вобласці.

**№ 82**



**№ 82** Юрый Мурадаў (Барысаў)
**Белыя простыя:** a1, b4, d2, e1, f2, g1, g3, h2 (8)
**Чорныя простыя:** b8, c5, d6, e5, e7, f4, f6, g7, h4 (9)

Наступныя пазіцыі складзеныя вядучым аддзела.

**№ 83**
**Белыя простыя:** a1, b2, b4, c3, e1, f2, g1 (7)
**Чорныя простыя:** c5, d2, d4, d6, e5, e7, f4, h6 (8)

**№ 84**
**Белыя простыя:** d4, e3, f2, f4, h4 (5)
**Чорныя простыя:** b4, b6, c5, e7, h6 (5)

**№ 85**
**Белыя простыя:** c1, d4, e3, f2, f4, g3, h4 (7)
**Чорныя простыя:** b4, b6, c5, e7, h2, h6 (6)

**№ 86**
**Белыя простыя:** d2, g1, дамкі: a1, g3 (4)
**Чорныя простыя:** a5, c7, d6, f6, g7, дамка: b4 (6)

Кампазіцыі ў шашкі-100 склаў украінскі шашачны кампазітар Анатоль Баланюк.

**№ 87**
**Белыя простыя:** 23, 25, 28, 29, 33, 36, 38, 50 (8)
**Чорныя простыя:** 10, 14, 17, 20, 24, 39, 40, 44 (8)

**№ 88**
**Белыя простыя:** 11, 12, 17, 21, 35, 43, 44, 50 (8)
**Чорныя простыя:** 2, 14, 15, 26, 29, 32, 38, 41, 45 (9)

**№ 89**
**Белыя простыя:** 15, 18, 19, 20, 23, 28, 31, 34, 39 (9)
**Чорныя простыя:** 4, 7, 9,10, 14, 17, 25, 26, 45 (9)

22 чэрвеня 60-гадовы юбілей сустрэў мінскі майстар Яўген Бельскі. Сённяшнія кампазіцыі прысвячаюцца юбіляру.

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні:
Выпуск № 167 ад 10.06.22.

№ 74 1. e1-d2 h4:f6 2. c7-b8 a5:c7 3. b8:g3 h2:f4 4. e3:e7 f8:d6 5. h6-g7 a3-b2 6. d2-c3 b2:d4 7. g7-f8 d6-e5 8. f8-g7 e5-f4 9. g7:c3 f4-g3 10. c3-d4 g3-h2 11. d4-g1 +

№ 75 1. e1-f2 h8:f6 2. f2-g3 h2:f4 3. c7-d8 a5:c7 4. d8:a3 +

№ 76 1. f2-g3 h2:d6 2. b4-c5 d6:d2 3. d4-e5 f6:d4 4. h4:c1 g7-h6 5. c1-d2 h6-g5 6. d2:h6 +

№ 77 1. f2-e3 d6:b4 2. e3-d4 a3:c1 3.d4-e5 f6:d4 4. g5-h6 c1:g5 5. h4:d8 h2:f4 6. d8-e7 f8:d6 7. h6:g5 b4-c3 8. g5-c1 +

№ 78 1. b6-c7 d8:d4 2. c1-b2 a3:g5 3. h4:d8 h2:f4 4. d8-f6 e5:g7 5. h6:g5 b4-c3 6. g5-c1
c3-b2 7. c1:a3+

№ 79 1. g1-f2 g3:e5 2. e1-d2 c3:g3 3. h2:f8 h6:d2 4. f8:b8+

№ 80 1. g1-f2 g3:e5 2. e1-d2 c3:g3 3. h2:b8 h6:f4 4. a1:c3 f4-e3 5. c3-d4 e3:c5 6. b8-e5 +

№ 81 1. g1-f2 g3:e5 2. e1-d2 c3:g3 3. h2:f8 h6:f4 4. f8:a3 +

Першымі дакладныя адказы даслалі: Л. Трафімчык (Іўе), А. і А. Высоцкія (г. Копыль), С. Рашэцін (Ашмяны), С. Бурко (Орша), В.Таўкачоў (Магілёўская вобл., Клімавіцкі р-н, в. Уздзевічы), У. В. Дударэвіч (Брэсцкая вобл., Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), А. Галаванаў, П. і В. Шульгі (усе Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), У. Ваўчкоў (Маладзечна).

*Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013,*
*e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru*

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**







# АСОБЫ І ІХ АДМЕТНЫЯ РОЛІ

**На наступным тыдні ў эфіры тэлеканалаў па традыцыі будуць адзначаць юбілейныя даты. І, вядома, не абыдзецца без спецыяльных паказаў мастацкіх, дакументальных стужак, дзе аўдыторыя зноў зможа сустрэцца з любімымі акцёрамі, рэжысёрамі, тэлевядучымі.**

Так, 28 чэрвеня споўніцца 60 гадоў вучонаму-мовазнаўцу, доктару філалагічных навук, прафесару Віктару Іўчанкаву. І з аўторка да чацвярга ў вячэрнім эфіры ўвазе гледачоў прадставяць лекцыі Віктара Іўчанкава з праграмы «Кафедра». У прыватнасці, будуць асвятляцца такія тэмы, як «Маўленчыя працэсы сучаснасці: заміксуй паці на лайме і мяце; Правапіс у гістарычным вымярэнні: пішам Манчэстар, а чытаем Ліверпуль» (БТРК, 2021 г.), «Мова і штучны інтэлект: віртуальная форма зносін; Ці спраўдзіцца мара чалавецтва — гаварыць на адной мове» (БТРК, 2022 г.) і іншыя. А непасрэдна ў сам дзень нараджэння вучонага зможам убачыць у выпуску праграмы «Суразмоўцы» на «Беларусь 3».

У чацвер 30 чэрвеня кінематаграфічны свет будзе згадваць акцёра, народнага артыста СССР Уладзіміра Дружнікава ў дзень яго 100-гадовага юбілею. З гэтай нагоды на «Беларусь 3» пакажуць мастацкі фільм «Канстанцін Заслонаў», які выйшаў на кінастудыі «Беларусьфільм» у 1949 годзе. У кінастужцы акцёр задзейнічаны ў галоўнай ролі — вядомага партызана, Героя Савецкага Саюза.

На канале «Культура» адзначаць 95-годдзе з дня нараджэння рэжысёра Уладзіміра Матыля. У суботу, 25 чэрвеня, гледачам пакажуць дакументальны фільм «Кіно — справа тонкая. Уладзімір Матыль». Кінаработы гэтага рэжысёра (ён зняў усяго 10 фільмаў) сталі ўсенародна любімымі. «Белае сонца пустыні», «Жэня, Жэнечка і «Кацюша» і іншыя маюць прыхільнікаў у некалькіх пакаленняў і сталі сапраўднай класікай. А вось пра тое, з якімі цяжкасцямі сутыкаўся рэжысёр пры іх стварэнні, як працаваў з акцёрамі, чаму не паступіў ва ўніверсітэт з-за юнацкага кахання, — распавядуць калегі і сябры Уладзіміра Матыля. Таксама зможам убачыць і працоўныя моманты са здымак апошняй яго карціны «Барвовы колер снегападу». А адразу пасля пакажуць мастацкі фільм рэжысёра «Звезда пленительного счастья» (1975 г.).

Тэлеканал АНТ 25 чэрвеня не абміне ўвагай жыццё і творчасць актрысы Наталлі Варлей, якой сёлета споўнілася



75 гадоў. Дакументальны фільм «Адна маленькая, але гордая птушачка...» распавядае пра артыстку, якую гледачы ведаюць па кінастужках «Каўказская палонніца», «Вій», «12 крэслаў» і многіх іншых. Менавіта роля палонніцы зрабіла яе вядомай і пазнавальнай, але калі ад артысткі пасля чакалі гайдаеўскую Ніну, то сама Варлей была тонкай, сарамлівай і ранімай. Пра тое, як актрыса пражывала свае ўдачы і спраўлялася з выпрабаваннямі лёсу, якой была ў дзяцінстве і дзе спасцігала прафесію, і раскажа дакументальная стужка.

А ў нядзелю, таксама на АНТ, не прапусціце дакументальны фільм «Шэсць мангустаў, сем кобр і адзін паўскарпіён» пра Мікалая Драздова, які ў гэтым годзе адзначае сваё 85-годдзе. Можа, нават няма такога тэлегледача, які б не ведаў праграму «У свеце жывёл» і яе вядучага. Імя Мікалая Драздова даўно ўжо стала брэндам тэлебачання, хоць сам вучоны-біёлаг зусім выпадкова трапіў у кадр і нават не марыў пра такую прафесію. Спачатку яго як арнітолага запрашалі ў студыю ў якасці эксперта, а калі вядучым праграмы стаў Васіль Пяскоў, то Драздову зрабілі нечаканую прапанову... Яго розум і кругагляд падкуплялі і тэлеаўдыторыю, і студэнтаў МДУ, дзе ён выкладаў. Для сваіх вучняў Мікалай Драздоў быў прыкладам біёлага XXI стагоддзя. Можа, тое і не дзіўна, паколькі ў сям'і вучонага былі і ўрачы, і настаўнікі, і ўрачы, і ваенныя. А яшчэ святары — людзі даволі падазронай прафесіі ў дзяржаве з атэістычнай ідэалогіяй. Усё гэта не магло не пакінуць адбітку на асобе Мікалая Драздова. Больш падрабязны аповед пра жыццё і атачэнне вядомага вучонага і тэлевядучага даведаецеся падчас прагляду фільма ў нядзелю 26 чэрвеня. Дарэчы, у верасні Мікалай Мікалаевіч плануе зладзіць творчы вечар у беларускай сталіцы, таму ў прыхільнікаў ёсць магчымасць загадзя падрыхтавацца да сустрэчы.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота з адкрытых крыніц.**


## «Са "Звяздой" цяплей»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на III квартал або на II паўгоддзе 2022 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 17 ліпеня 2022 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Сярод падпісчыкаў будуць разыграны 7 апрысквальнікаў садовых «Жук Класік» ОП-207/0444 (8 літраў) і суперпрыз — трымер электрычны Oasis TE-50. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце да 30 ліпеня 2022 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 30 верасня 2022 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або на II паўгоддзе 2022 года. Пасля 30 верасня 2022 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні чытайце ў нумары 99 ад 24 мая 2022 года.

**Тэлефоны для даведак: (017) 271-81-53, 311-17-40.**





Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4195 ад 18.05.2022 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

## Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або на II паўгоддзе 2022 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку ______________________

______________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ______________________
(аддзяленне сувязі)
______ на III квартал або на II паўгоддзе 2022 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) [ ] (індэкс) ______

______________________

______________________

Удачы ў розыгрышы!